**Юрась Рапецкі: Біблійны адказ на чалавечую дылему**

Анатацыя. Асноўнай кнігай для хрысьціян зьяўляецца сьвятая Біблія. Апрача разнастайных пытаньняў у ёй шмат пішацца пра чалавечую дылему мець і падтрымліваць блізкія адносіны з Богам Творцам і людзьмі. Аўтар артыкула «Біблійны адказ на чалавечую дылему» паказвае, што ў Бібліі нямала гаворыцца пра чалавечую праблему зла. Паводле Бібліі Бог жадае ўвайсьці ў блізкія стасункі зь людзьмі, іх зьмяніць на лепшых у адносінах з Богам і іншымі людзьмі. Паміж Богам і людзьмі ўзьнімаецца перашкода – менавіта, чалавечыя грахі. Гэта было ўпершыню паказана пры жыцьці першых Богам створаных людзей, Адама і Евы, якія былі зьмешчаныя ў Эдэмскім садзе. Яны парушылі Божы загад і за гэта былі выгнаны з саду на цяжкое і турботнае жыцьцё. У артыкуле аўтар піша пра вынікі чалавечай грэшнасьці, што адчуваецца кожным чалавекам і нават паміж народамі. Біблія паведамляе, што людзі маюць патрэбу ў Ратавальніку ад грахоў і іхніх вынікаў. Тым Ратавальнікам зьяўляецца Ісус Хрыстос. Юдэйскія ўлады ўкрыжавалі Яго за тое, што лічылі яго блюзьнерам, але на самай справе Ён памёр як Божая ахвяра за чалавечыя грахі ды ўваскрэс зь мёртвых для апраўданьня веруючых у Яго. Хрыстова сьмерць і ўваскрэсеньне дало чалавецтву магчымасьць атрымаць дараваньне грахоў і шчасьлівае вечнае жыцьцё. Калі людзі і цэлыя народы наварочваюцца да Хрыста і прымаюць Яго за свайго Збаўцу і Госпада-Уладара, Ён зьменьвае іх жыцьцё да лепшага. Так можа стацца для кожнага з нас паасобку, але таксама для нашых славянскіх народаў і краін.

***Наша дылема і дзе знайсьці адказы на яе***

Людзі ўсюды згодныя з тым, што жыцьцё чалавечае, хоць і дае нам прыемныя моманты, ўсё-такі даволі сумнае. Мы ўсе перажываем цяжкія і турботныя часы і ня раз пытаемся, чаму трэба пераносіць столькі непрыемнасьцяў? Чаму ў сьвеце людзі пакутуюць, тым часам калі б жыцьцё для іх магло быць лепшым? Чаму ўлады адной краіны прымаюць рашэньне ваяваць супроць суседняй і лічаць гэта неабходным і справядлівым, калі яно ў большасьці выпадкаў ня так? Мы ўсе адчуваем, што з чалавецтвам нешта пайшло ня так. Не ўсё з намі ў парадку. Штосьці адбылося з чалавечым родам і павяло яго не па шляху поўнага дабрабыту і шчасьця, чаго мы ўсе рупліва прагнем і да чаго імкнёмся. Што ж менавіта пайшло ня так? Чым усё гэта растлумачыць?

Многія хрысьціяне перакананыя, што існуе толькі адна аўтарытэтная крыніца, якая дае праўдзівыя адказы на такія пытаньні. Гэтай крыніцай зьяўляецца Біблія. Пасьлядоўнікі Ісуса Хрыста лічаць, што ў Бібліі перадаюцца словы і думкі Бога Творцы для ўсяго чалавецтва. Карацей, Біблія ёсьць Слова Божае для кожнага чалавека. Паважаны чытачу, можа, асабіста для цябе Біблія ня мае такога значэньня, але я хацеў бы падахвоціць цябе зьвярнуць увагу на яе тлумачэньні пра цяперашні стан чалавецтва з Божага пункту гледжаньня і на яе адказы, як паправіць адмоўныя зьявы ў нашым родзе. Пазнаёміўшыся зь біблійным поглядам, ты зможаш ацаніць яго ды прыйсьці да сваёй высновы аб ягонай праўдзівасьці або памылковасьці.

На першых старонках Бібліі мы знаёмімся з грунтоўнымі прычынамі нашага няшчаснага стану. Але перш чым назваць прычыны, спынімся на тэме зьяўленьня чалавека на зямлі. У наш час сталася модным лічыць, што чалавек паявіўся на зямлі ў выніку эвалюцыйнага працэсу, але Біблія ясна пярэчыць такому тэзісу і абвяшчае, што першыя людзі зьявіліся на сьвеце дзякуючы Богу Творцу, Які стварыў і пасяліў іх у найпрыгажэйшым месцы. Пра стварэньне чалавека пішацца ў першай кнізе Бібліі Быцьцё гэтак: «І сказаў Бог: створым чалавека паводле вобразу Нашага, паводле падабенства Нашага; і хай уладараць яны над рыбамі марскімі і над птушкамі нябеснымі і над быдлам, і над усёю зямлёю, і над усімі гадамі, што поўзаюць па зямлі. І стварыў Бог чалавека паводле вобразу Свайго, паводле вобразу Божага стварыў яго: мужчыну і жанчыну стварыў іх».[1]

Гэтыя біблійныя словы раскрываюць, адкуль узяліся асноўныя рысы, якасьці і здольнасьці чалавека. Калі чытаеш біблійнае апісаньне новастворaных людзей, дык відаць, што яны былі паселены ў дасканалай, нічым не сапсаванай, мясцовасьці. «Пасадзіў Госпад Бог рай у Эдэме на ўсходзе, і зьмясьціў там чалавека, якога стварыў»,– чытаем.[2] Божая маральная чысьціня і дасканаласьць адлюстраваліся ў першапачатковым несапсаваным стане першай шлюбнай пары. Пішацца: «Былі абое голыя, Адам і жонка ягоная, і не саромеліся».[3] Галізна была нармальным і бязгрэшным станам. Далей сказана, што Бог рашыў стварыць першых людзей паводле Свайго вобразу і падабенства, што азначае – чалавек хоць у некаторых

[1]Быцьцё 1:26-28

[2]Там жа, 2:8

[3]Там жа, 2:25

здольнасьцях стаўся падобным да Бога Творцы. Ён у рысах і здольнасьцях адлюстраваў вобраз Бога! У якіх менавіта? У наступных...

***Божыя і нашыя падобныя рысы***

Па-першае, чалавек нясе і выяўляе Божы вобраз разважаньня. Кожны чалавек думае сам для сябе. Ён выбірае, узважвае, вырашае розныя пытаньні і прымае асаблівыя крокі, карыстаючыся сваім Богам дадзеным розумам, з дапамогай якога ён ацэньвае жыцьцёвыя сытуацыі і прыходзіць да самых выгодных яму рашэньняў і дзеяў. Такая здольнасьць дорыцца Богам кожнаму чалавеку, хоць у кожнай асобы яна праяўляецца па-свойму адметна.

Па-другое, чалавек нясе і выяўляе маральны вобраз Бога. Мы ўсе жывём з адчуваньнем правільнага і няправільнага і вызначаем сабе, што можна або нельга рабіць. Гэта праўда, што людзі часамі не пагаджаюцца паміж сабою ў ацэнцы таго, што правільнае, а што няправільнае, але мы ўсе супольна фармуем і фармулюем свае асноўныя маральныя прынцыпы, жывём паводле іх і патрабуем падобнага ад іншых людзей, зь якімі падтрымліваем стасункі. Адкуль ідуць маральныя пачуцьці і прынцыпы? Біблія адказвае – ад Бога Творцы, Які ўклаў у нашую душу сэнс маральных паводзінаў і прыстойнасьці. Мы прытрымліваемся адмысловых маральных прынцыпаў у стасунках зь іншымі людзьмі, бо Бог уклаў у нас асэнсаваньне, што ёсьць дабро, а што – зло.

Па-трэцяе, у сувязі з вышэй сказаным кожны чалавек карыстаецца здольнасьцю выбіраць адно ці другое. У большасьці выпадкаў ён разважае і выбірае той шлях, які яму здаецца найлепшым і самым праведным. Мы штодня рашаем, што, як і калі нам трэба нешта рабіць. Адкуль мы атрымалі такую здольнасьць? Згодна біблійнаму вучэньню ад нашага Творцы.

Па-чацьвёртае, мы нясём і выяўляем Божы вобраз у тым, што падтрымліваем адносіны зь іншымі людзьмі. Гэта ж мы заўважаем у Богу, бо ў Бібліі Бог Творца прадстаўлены ў множным ліку. Вось мы ўжо прачыталі словы Бога: «*Створым* чалавека паводле вобразу *Нашага,* паводле падабенства *Нашага*». Чаму тут ужываюцца словы «створым» і «нашага»? Таму, што Бог, хоць Ён адзіны, але таксама існуе ў трох Асобах. Біблія адкрывае нам Бога ў трыадзінстве Бога Айца, Бога Сына і Бога Духа Сьвятога. Паміж Імі заўсёды існавала цесная сувязь. Цікава і значна тут жа адзначыць, што мы, людзі, таксама маем і карыстаемся здольнасьцю разьвіваць і падтрымліваць цесныя адносіны зь іншымі людзьмі. Хрысьціяне вераць,

што паміж адметнымі Асобамі Бога заўсёды трывала цесная сувязь, поўная любоў адзін да аднаго і згода, а гэта сьведчыць аб тым, што адзіны Бог у трох Асобах надзяліў кожнага чалавека тою самаю здольнасьцю разьвіваць і падтрымліваць цесныя стасункі, так, з Богам, а таксама зь людзьмі.

Пятая здольнасьць, характэрная для Бога Творцы, якая выяўляецца і паказваецца ў чалавеку, вынікае з Божага наказу людзям уладарыць над усім жывёльным і расьлінным сьветам і над усёю зямлёю, адным словам, над Божым тварэньнем. Гэта важна з тае прычыны, што з усяго Богам створанага чалавек займае найвышэйшае становішча, і Бог даручае ўладарыць над тварэньнем разважліва, мудра і з поўнай адказнасьцю. Калі людзі абачліва і разумна карыстаюцца шчадротамі прыроды згодна з Божай воляй, то яны, як правіла, жывуць шчасьліва і адно аднаму ня шкодзяць. А калі Бога Творцы людзі ня слухаюцца, дык у іхняе жыцьцё ўваходзяць усялякія бедзтвы і гора. Эдэмскі сад, дзе Бог пасяліў першых людзей, Адама і Еву, быў дасканалым сьветам зь вялікім патэнцыялам жыцьцёвага шчасьця, а менавіта такога патэнцыялу мы ўсе сабе жадаем і да яго імкнёмся.

***Раскол паміж людзьмі і Богам***

Спачатку Адам і Ева жылі ў блізкай лучнасьці з Богам. Колькі часу гэта доўжылася, ніхто ня ведае, бо ў Бібліі гэты тэрмін не акрэслены. Аднак прыйшоў дзень, калі нешта благое і няшчаснае здарылася паміж Богам і першымі людзьмі. Цесная сувязь паміж імі раптам спынілася. Адам і Ева пачалі Бога баяцца, хавацца ад Яго замест таго, каб зь нецярпеньнем чакаць сустрэчы зь Ім. Яны пераступілі Божы загад, што ў Бібліі лічыцца грахом. У хрысьціянскіх колах мы называем гэтую падзею ў жыцьці першых людзей грэхападзеньнем, калі Адам і Ева зграшылі і лучнасьць паміж імі і Богам спынілася. Зьмяніліся адносіны паміж Богам і імі – гэта адно, але таксама разарваная сувязь працягвалася трываць паміж Богам і нашчадкамі Адама і Евы. У выніку першага акта непаслушэнства Богу шмат чаго іншага перамянілася і пагоршылася для ўсяго чалавецтва.

Што ж здарылася? Мы чытаем, што Бог паставіў «дрэва спазнаньня дабра і зла» ў сярэдзіне Эдэмскага саду і загадаў Адаму і Еве ня браць пладоў зь яго. Мы чытаем: «І наказаў Госпад Бог чалавеку, кажучы: „З кожнага дрэва ў садзе ты будзеш есьці, а з дрэва спазнаньня дабра і зла, ня еж зь яго; бо ў дзень калі ты пакаштуеш зь яго, сьмерцю памрэш”».[4] Цікава, чаму Бог паставіў такое дрэва ў садзе? Дзеля якой мэты,

[4]Там жа, 2:16-17

калі Ён напэўна загадзя ведаў, да чаго яно прывядзе чалавека? Адказ мы знаходзім у тым, што Бог гэтакім чынам даў першым людзям магчымасьць карыстацца сапраўдным свабодным выбарам. Адам і Ева не былі робатамі, якія неабдумана выконвалі волю Творцы. Яны маглі думаць і рашаць, што рабіць або чаго не рабіць. Чаму такая здольнасьць была патрэбная Адаму і Еве? Таму, што пашана і любоў да Творцы даказваецца тым, што чалавек слухаецца Яго добраахвотна. Без свабоднага выбару любому чалавеку немагчыма было б даказваць сваю пашану і любоў да Бога. Дзеля гэтага Бог зьмясьціў «дрэва спазнаньня дабра і зла» ў сярэдзіне саду, і першыя людзі маглі або слухацца або ня слухацца Яго.

Біблія далей паведамляе, што перад грэхападзеньнем чалавека зло ўжо ўвайшло ў Эдэмскі сад і, перш за ўсё, прыйшло да Евы праз зьмея. Гэта быў зламысьнік шатан, які зьявіўся Еве ў выглядзе зьмея. Ён пераканаў яе, што яна не памрэ, калі пакаштуе забаронены плод. Вынік шатанскага спакушэньня Евы апісваецца гэтакімі словамі: «І ўбачыла жанчына, што дрэва добрае для ежы, і што яно прыемнае вачам і панаднае, бо дае веду; і ўзяла пладоў зь яго і ела; і дала таксама мужу свайму, і ён еў. І адамкнуліся вочы ў іх абаіх, і ўведалі яны, што голыя, і сшылі фігавыя лісты, і зрабілі сабе перапаяскі».[5] Парушыўшы загад Творцы, першая шлюбная пара пачала адчуваць сорам перад Богам з-за сваёй галізны, пра што раней ня думалі і чаго ня ведалі. Яны зразумелі, што зрабілі надта сур’ёзную памылку, але было ўжо запозна выправіць яе. За непаслушэнства Бог паведаміў Еве, што яна будзе раджаць дзяцей з болямі і што ейная цяга будзе да мужа, а ён будзе ўладарыць над ёю. Адаму Бог вымавіў, што яму давядзецца цяжка працаваць і ўрабляць зямлю, каб зь яе карміцца. Адам і Ева былі выгнаныя з Эдэмскага саду, іх жыцьцё моцна ўскладнілася; ім выпалі вялікія цярпеньні, якіх яны датуль ня ведалі. Парушыўшы Божы загад, яны адразу фізычна не памерлі, але ў іншым сэнсе сьмерць спазналі. У чым жа менавіта?

***Вынікі расколу***

Па-першае, сваім актам непаслушэнства Богу Адам і Ева спынілі далейшую блізкую лучнасьць зь Ім. Пасьля грэхападзеньня яны адчулі, што зрабілі грунтоўную памылку і пачалі баяцца Бога і ад Яго хавацца. Яны перасталі жадаць той ранейшай жаданай і радаснай сустрэчы зь Ім.[6] У дачыненьні да моманту чалавечага грэхападзеньня цікава зьвярнуць увагу на тлумачэньне апостала Паўла ў Пасланьні да рымлянаў, дзе сказана: «Як праз аднаго чалавека (Адама) ўвайшоў у сьвет грэх, а праз грэх – сьмерць, і гэтак сьмерць перайшла на ўсіх людзей з-за таго, што ўсе

[5] Там жа, 3:6-7

[6] Там жа, 3:8

зграшылі». Гэта паказвае, што кожны з нас своечасова паўтарае памылку Адама і Евы, то бок мы ўсе калісьці ў сваім жыцьці аднолькава грашым, парушаем асаблівы пункт або пункты Божага закону. Грэшны учынак Адама, нашага прабацькі, праявіў свой уплыў на нас усіх. Кожнага з нас закране фізычная сьмерць, мы ўсе ў будучым памром. Гэта першы вынік Адамавага грашэньня.

Другі ў тым, што мы ўсе ад Адама атрымалі ў спадчыну аслабленую натуру, што зь цягам часу падаецца спакусе. Мы ўсе своечасова парушаем Божы закон, грашым. Мы таксама перажываем духоўную сьмерць перад сьвятым і праведным Богам у тым сэнсе, што ў пачатку жыцьця не адчуваем ніякай блізкасьці з Богам. Напачатку Ён для нас чужы. Апостал Павал тлумачыць, што перад навярненьнем да Хрыста мы ўсе знаходзіліся ў стане духоўнай мёртвасьці перад Богам. Па ягоным меркаваньні: «І вас, мёртвых у вашых правінах і грахах, у якіх вы некалі жылі паводле звычаю князя ўлады ў паветры (то бок – шатана), духа, які дзейнічае цяпер у сынах непакорлівасьці, між якіх і мы ўсе некалі жылі ў пажадлівасьцях нашага цела, выконваючы жаданьні цела і думак, і былі з прыроды дзецьмі гневу, як і астатнія».[7] Сказана па-другому, мы паўтараем памылку Адама і Евы. Гэта праўда, што яны былі падбухтораны шатанам. Пад уплывам шатанскай спакусы Ева сарвала плод з дрэва, пакаштавала і перадала мужу. Якую б ролю шатан ні адыгрываў у гэтым працэсе, адно застаецца ясным і бясспрэчным, – менавіта тое, што Адам і Ева рашылі ўчыніць забароненае Богам, акт іхняга непаслушэнства раскалоў і адасобіў іх ад Госпада Бога. Паўтараю: у Бібліі такое стаўленьне да Бога і такі ўчынак называецца грахом. Мы ўсе своечасова становімся вінаватымі перад Богам, выбіраючы свой уласны шлях і такім чынам адступаемся ад нашага Творцы. У выніку нашага непаслушэнства Яму мы ўсе аднолькава перажываем жыцьцёвыя складанасьці і перажываньні.

Ёсьць яшчэ і іншы вынік чалавечага грэхападзеньня. Першая пара перажыла духоўна-сацыяльную сьмерць, згодна зь якой яны адчужаліся адно ад аднаго. Муж з жонкай упершыню спазналі, што такое канфлікт паміж сабою. Калі пасьля грэхападзеньня Бог увайшоў у сад з намерам сустрэцца з Адамам і Евай, яны, адчуўшы сорам, хаваліся ад Яго. Бог іх знайшоў і адразу запытаўся ў іх, ці яны насамрэч бралі плод з дрэва спазнаньня дабра і зла? Адам адказаў, што так, ён пакаштаваў зь яго, але ўсю віну за гэта ўсклаў на жонку, бо яна была першая, якая падупала спакусе, сарвала плод з дрэва, пакаштавала і тады толькі перадала яму. Калі Бог спытаўся ў Евы, ці яна сарвала фрукт з дрэва спазнаньня дабра і зла і пакаштавала яго, яна адказала, што «так» – гэта яна зрабіла, але за гэты ўчынак перакінула ўсю віну на шатана-зьмея за тое, што ён яе спакусіў. Паважаны чытачу,

[7] Пасланьне да эфэсянаў 2:1-3

ці ж ня тое самае і мы робім, калі грашым і нехта ўказвае на наш грэх? Абвінавачваем кагосьці іншага, толькі не сябе, калі па справядлівасьці павінны прыняць на сябе поўную адказнасьць за парушэньне Божага закону.

***Хто тут вінаваты?***

Калі мы самі рашаем і робім тое, што нам асабіста падабаецца, а гэта супраціўляецца Божай волі, то ўваходзім у канфлікт з Богам і іншымі людзьмі. Апостал Якаў піша так пра нашыя грэшныя пажадлівасьці і паводзіны: «Адкуль войны і адкуль бітвы між вас? Ці не адгэтуль: ад вашых пажадлівасьцяў, якія змагаюцца ў вашых членах? Вы хочаце – а ня маеце; вы забіваеце і зайздросьціце – і ня можаце дасягнуць, сварыцеся і ваюеце. Вы ня маеце, бо ня просіце. Вы просіце – і не атрымліваеце, бо не на дабро просіце, а дзеля таго, каб растраціць на свае асалоды».[8] Мы часта патрабуем, каб усё выконвалася так, як хочацца альбо падаецца найлепшым нам, і ў выніку таго ня раз канфліктуем зь іншымі людзьмі, а гэта спрыяе нашаму далейшаму расколу зь імі. Тое самае мы можам сказаць пра канфлікты, якія паўстаюць паміж краінамі і народамі.

Гэтымі днямі мы назіраем тую ж працяглую вайну паміж Расеяй і Украінай, і тое ж самае бачым паміж ізраільцянамі і палестынцамі. Пры такіх канфліктах мы часта перш за ўсё ставім пытаньне: а хто ўпершыню напаў на свайго ворага? І заключаем, што вось ўлады той краіны стартавалі вайну, таму і яны ж вінаватыя. Яны ж праявілі сваю «пажадлівасьць», як піша біблійны аўтар Якаў, і рызыкнулі з надзеяй, што вельмі хутка здабудуць сваю мэту – перамогу.[9] А што здарылася б, калі б палітычныя лідэры атакуючых краін былі веруючымі ў Бога і Хрыста і рашылі не ваяваць з суседняй краінай? Яны ж хутчэй за ўсё шукалі б вырашэньня пры канфлікце перагаворамі з уладамі варожай краіны? На жаль, пры канфліктах паміж краінамі такога найчасьцей мы не заўважаем. Замест таго яны адпраўляюць сваіх ваяроў на разбурэньне варожай краіны. І што з гэтага выходзіць? Насільле і забойства выклікае тую ж самую рэакцыю ў тых, хто перанёс першыя страты. Такі цыкл паўтараецца пастаянна як у нашых пэрсанальных жыцьцях, гэтаксама ў інтэрнацыянальных адносінах паміж народамі і краінамі. Але якія вынікі бачылі б мы, калі б людзі лічыліся з Божай воляй? Каб мы ўсе знаходзіліся ў блізкіх адносінах з Богам і Ісусам Хрыстом і думалі аб Іхняй волі ў дадзенай сытуацыі, то шанцы на мірныя перагаворы

[8] Пасланьне Якава 4:1-3

[9] Памятайма, што ўлада ў Беларусі дала расейцам пляцдарм для атакі зь яе зямлі на Кіеў.

і вынікі шматкроць памножыліся б? У большасьці выпадкаў улады пра Бога і Ягоную волю ня думаюць, таму і зь ёю ня лічацца. Словы апостала Якава сапраўды выконваюцца перад нашымі вачыма.

Гэта прыгадвае нам біблійнае настаўленьне пра вынікі нашых рашэньняў і паводзін з Божага пункту гледжаньня. Апостал Павал піша ў Пасланьні да галятаў: «Не ашуквайцеся, з Бога не пасьмяесься, бо што пасее чалавек, тое і пажне; бо той, хто сее дзеля свайго цела (інакш кажучы, для сваіх уласных грэшных інтарэсаў), пажне ад цела тленнае, а той, хто сее дзеля Духа (Божага), пажне ад Духа жыцьцё вечнае. І, робячы дабро, ня будзем журыцца, бо ў свой час пажнём, калі не аслабеем. Дык пакуль маем час, будзьма рабіць дабро ўсім, а найбольш сваім па веры».[10]

***Яшчэ пара вынікаў грэхападзеньня***

Чалавек перажывае вынікі чацьвёртай формы сьмерці. Маецца на ўвазе экалягічная сьмерць, якая тычыцца і самой зямлі. З тае прычыны, што першыя людзі зграшылі, яны былі выгнаны з Эдэмскага саду і ім трэба было цяжка працаваць, каб здабываць сабе плады зямлі ды імі карміцца. Бог сказаў Адаму: «За тое, што ты паслухаўся голасу жонкі тваёй і еў з дрэва… праклятая зямля за цябе; са скрухаю будзеш карміцца зь яе ва ўсе дні жыцьця твайго. Церне і ваўчкі ўзгадуе яна табе, і будзеш карміцца польнаю травою. У поце твару твайго будзеш есьці хлеб, пакуль ня вернесься ў зямлю; бо пыл ты і ў пыл вернесься».[11] Спачатку Адам і Ева даглядалі Эдэмскі сад і ня ведалі цяжкой працы дзеля свайго выжываньня, а пасьля акту непаслушэнства ўсё для іх зьмянілася. Нават сёньня многім людзям трэба цяжка працаваць, каб мець дастаткова пладоў зямлі і карміцца імі на выжываньне. Як сказана ў Бібліі, хто не працуе, той ня есьць.[12]

Пяты від сьмерці, які мы раней прыгадалі, ёсьць фізычная сьмерць. Кожны з нас своечасова памрэ. Мы старэем, і цела нашае марнее; прыходзіць той дзень, калі нейкі орган або органы цела перастаюць нармальна функцыянаваць, і мы паміраем. У Эдэмскім садзе гаворкі пра сьмерць не было, пакуль Адам і Ева не зграшылі. Бог хацеў, каб яны жылі вечна, але яны зграшылі і гэтым самым падвялі сябе пад пакараньне сьмерцю. Але трэба тут жа дадаць, што згодна з вучэньнем Бібліі пасьля фізычнай сьмерці цела жыцьцё для нас не спыняецца. Мы пераходзім у жыцьцё замагільнае, пры якім застаёмся ў поўнай прытомнасьці і ідзём у адно з двух месцаў

[10]Пасланьне да галятаў 6:7-10

[11]Быцьцё 3:17-19

[12]Пасланьне да фесаланікіцаў 3:10

– альбо ў неба, каб жыць вечна з Госпадам Богам, альбо ў пекла, куды будуць укінуты шатан і ягоныя памагатыя, дэманы. Вечная загуба ў пекле – вось гэта шостая форма духоўнай сьмерці.

Так апісвае Біблія чалавека і ягоны лёс. Многія, пачуўшы такое тлумачэньне, кажуць, што не прымаюць першых разьдзелаў Бібліі як гістарычны дакумэнт. Адама і Евы ніколі і нідзе не было, сьцьвярджаюць яны. Гэта толькі – легенда, выдуманая людзьмі, і прапануецца яна толькі як прыклад нам. Можа, паважаны чытачу, і ты так мяркуеш. Мы тут жа ня будзем трактаваць пытаньне аб гістарычнасьці або негістарычнасьці першых разьдзелаў Бібліі, хоць мы лічым гісторыю пра Адама і Еву фактычнай, але, прынамсі, скажам наступнае. З адным пунктам мы ўсе можам згадзіцца, калі бяром пад увагу усё тое, што гаворыцца пра духоўны стан людзей у Бібліі, – менавіта тое, што біблійнае апісаньне чалавецтва ў шмат якіх аспэктах адпавядае таму, што мы бачым ў жыцьці сучаснага чалавечага роду.

Да таго ж, людзі працуюць, – часам вельмі цяжка, – і ў сваёй працы не знаходзяць ніякага задавальненьня. Яны працуюць, каб зарабляць на хлеб. З другога боку, трэба сказаць, што мы працуем з надзеяй, што нашая праца, нашыя добрыя ўчынкі і дасягненьні будуць заўважаны і ацэнены, – што, можа, нам і падзякуюць за гэта. У большасьці выпадкаў мы хочам, каб нашае жыцьцё і праца не прапалі марна, а паслужылі на дабро іншым людзям. Як бы мы ні стараліся знайсьці сэнс і значэньне для свайго жыцьця, адно нас заўсёды непакоіць, – што прыйдзе той момант, калі мы памром, і хто пасьля нашага адыходу ўспомніць пра нас і нашую працу? Зь бегам часу напэўна нават і гэта забудзецца. Што станецца канкрэтна са мною, калі памру? Ці будзе нейкае замагільнае маё існаваньне, ці будзе для мяне ўзнагарода за мае сумленныя спробы служыць і дапамагаць іншым тут на зямлі? Хто можа даць нам вычарпальныя і неаспрэчныя адказы на такія пытаньні?

Яшчэ раз паўтараем нашае хрысьціянскае перакананьне – толькі Біблія дае праўдзівыя і актуальныя адказы. Толькі ў Бібліі гаворыцца пра тое, як можна зьмяніць сытуацыю і вярнуць чалавека да свайго першаснага стану, калі грэх яшчэ яго не кранаў і калі ён жыў шчасьлівым жыцьцём у блізкай лучнасьці са сваім Творцам.

***Наша слабасьць перад Богам***

Перш за ўсё, Біблія пацьвярджае, што ўсе мы, без выключэньня, грэшнікі перад дасканалым і праведным Богам. Калі яно так, дык думалася б, найлепшае, што мы можам рабіць, каб наблізіцца да Бога, – гэта проста слухацца Яго і выконваць загады Ягонага закону. Але на самай справе ўсё ня так проста; мы сутыкаемся з асаблівымі

складанасьцямі. Чаму? Таму, што, колькі б мы ні стараліся і зь якімі б добрымі намерамі і нават рашучасьцю ні прыступалі да гэтай справы, мы ўся роўна, па слабасьці нашай грэшнай натуры, ня можам дасканала выконваць загады Божага закону. У нас проста не хапае ані сілы, ані здольнасьці. Апостал Павал сам гэта перажываў і напісаў: «Добрага, якое хачу рабіць, не раблю, а ліхое, якое не хачу рабіць, раблю. А калі раблю тое, чаго не хачу, дык ужо ня я раблю тое, а грэх, які жыве ўва мне».[13] Калі ён тут ужывае слова «грэх», дык мае на ўвазе адмоўны ўплыў і кантроль нашай натуры, прыхільнай да грашэньня. Тое, што апостал Павал перажываў, збываецца ў кожнага з нас.

Калі яно так і ёсьць, дык навошта тады быў дадзены закон Божы? Апостал піша пра ролю Божага закону гэтак: «Я ўведаў грэх не інакш, як праз закон, бо я і пажадлівасьцяў не заўважыў бы, калі б закон не казаў: “не пажадай”. Але грэх, ухапіўшыся за магчымасьць праз запаведзь, выклікаў ува мне ўсялякую пажадлівасьць, бо без закону грэх мёртвы, а я жыў некалі без закону, але калі прыйшла запаведзь, грэх ажыў, а я памёр, і запаведзь на жыцьцё зрабілася мне на сьмерць…мы ведаем, што закон – духоўны, а я цялесны, прададзены граху».[14] Гэтымі словамі апостал Павал сьцьвярджае, што закон Божы дапамог яму зразумець, што дасканала выконваць загады Божыя ніхто з нас ня можа. На самай справе замест таго, каб падахвочваць апостала выконваць Госпаднюю запаведзь, Божы закон абудзіў у ім грэшную пажаданасьць. Гэта падобна да таго, як калі б маці або бацька загадвалі дзіцяці нечага не рабіць. Пачуўшы забарону, дзіця робіць тое, што было забаронена яму. Пакуль нічога ня кажаш дзіцяці пра забарону, яно яе не парушае. Так і грэх абуджаецца ў нас, калі мы чуем загады, нават запаведзі Божага закону.

Чаму так бывае? Таму, што нашая грэшная натура праяўляе сваю сілу і падбухторвае нас Бога ня слухацца. Гэта – першая прычына. Ёсьць і іншая – менавіта тое, што нашая грэшная натура і шатан нас падманваюць. Калі мы думаем, што дагаджаем Богу, выконваючы Ягоны закон, дык неўзабаве бачым, што памыляемся, бо мы ў прынцыпе бясьсільныя выконваць усе патрабаваньні Божага закону. Многія людзі, якія адчуваюць хоць нейкую цягу да Бога, усё адно парушаюць закон. Слова Божае паведамляе, што, «хто выконвае ўвесь закон і згрэшыць у адным, той робіцца вінаватым ва ўсім».[15] Інакш кажучы, можаш парушыць адну асаблівую запаведзь Божага закону, што ў Госпадніх вачах аказваецца падобным да парушэньня ўсіх запаведзяў.

[13]Пасланьне к рымлянам 7:19-20

[14]Там жа, 7:7-14

[15]Пасланьне Якава 2:10

Калі яно сапраўды так, дык мы зноў пытаемся: дзеля чаго тады нам быў дадзены закон Божы? Адказ мы знаходзім у апосталавых словах: «Закон быў для нас павадыром да Хрыста, каб нам апраўдацца вераю».[16] Вось у чым справа! Бог даў нам закон, каб мы даведаліся і зразумелі, што ня маем ані сілы, ані здольнасьці бездакорна выконваць Ягоныя наказы. Закон асуджае нас за непаслушэнства Богу і ня можа зьмяніць нашую грэшную натуру, якая вядзе нас да грашэньня. Так і піша апостал Павал: «Мы ведаем, што закон, калі што гаворыць, гаворыць да тых, хто пад законам, так што замыкаюцца ўсякія вусны, і ўвесь сьвет робіцца вінаватым перад Богам, бо дзеямі закону не апраўдаецца перад Ім ніякая плоць; бо законам спазнаецца грэх[17]…закон, аслаблены плоцьцю, быў бясьсільны…».[18] Ня маючы поўнага посьпеху ў выконваньні закону, мы можам прыйсьці толькі да адной высновы, – што мы зьяўляемся аслабленымі грэшнікамі, якія маюць патрэбу ў Божай дапамозе. Нам патрэбны Збаўца і Памочнік. Ці ёсьць такая асоба? Дзякаваць Богу, ёсьць! Апостал Павал піша: «Няшчасны я чалавек! хто вызваліць мяне ад гэтага цела сьмерці? Дзякую Богу майму – праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага».[19] Ісус Хрыстос – адзіная надзея для ўратаваньня ад слабасьці нашай грэшнай натуры і ад пакараньня за ўчыненыя намі грахі!

### *Ісус Хрыстос – наш Ратавальнік*

Ісус Хрыстос зьяўляецца і чалавекам і Богам. Калі аднаго разу габрэйскія фарысэі запыталіся ў Яго, хто Ён такі, Ён адказаў: «Раней за Абрагама Я ёсьць».[20] Сярод юдэяў тэрмін «Я ёсьць» прыстасоўваецца толькі да Бога Творцы. Фарысэі разумелі, што гэтымі словамі Ісус Хрыстос называў сябе Богам, таму і рыхтаваліся камяніць Яго за блюзьнерства, але час Ягонай сьмерці яшчэ не прыйшоў, і Ён спакойна адступіўся ды пайшоў ад іх. Апостал Павал пазьней напісаў пра Хрыста, што «Ён вобраз Бога нябачнага»,[21] што Ісус Хрыстос быў «водбліскам славы Ягонай [Божай] і вобразам істоты Ягонай».[22] Ісус Хрыстос ёсьць Бог, але быў Ён таксама чалавекам, бо нарадзіўся, як нараджаецца кожны з нас. Сябе Ён часта называў Сынам

[16]Пасланьне да галятаў 3:24

[17]Пасланьне да рымлянаў 3:19-20

[18]Там жа, 8:3

[19]Там жа, 7:24-25

[20]Дабравесьце паводле Яна 8:58

[21]Пасланьне да каласянаў 1:15

[22]Пасланьне да габрэяў 1:2

Чалавечым, што ўказвала на Ягоную чалавечнасьць. У гэтай Асобе мы бачым сапраўднага Богачалавека.

Будучы Богам і чалавекам, Ён пражыў жыцьцё на зямлі, не ўчыніўшы ніякага грэху. З усіх людзей толькі Ісус Хрыстос цалкам выканаў усе патрабаваньні Божага закону. Апосталы гэта заўважылі і засьведчылі. Апостал Пётра напісаў так пра Хрыста: «Не ўчыніў Ён ніякага грэху, і не было падступства ў вуснах Ягоных».[23] Чаму гэта важна? Таму, што Бог Айцец загадзя выбраў Яго дзеля таго, каб Ён памёр ахвярнай сьмерцю за грэшных людзей.[24] Мы чытаем словы аднаго прарока Божага, Яна Хрышчальніка, які сказаў, убачыўшы Хрыста: «Вось Ягня Божае, Якое бярэ на Сябе грэх сьвету».[25] Гэтую ісьціну пацьвердзіў апостал Пётра: «Ён грахі нашыя Сам узьнёс Целам Сваім на дрэва, каб мы, адцураўшыся грахоў, жылі дзеля праведнасьці; ранамі Ягонымі вы ацаліліся».[26]

Для старазапаветнага габрэйскага народа Бог устанавіў духоўнае служэньне, паводле якога сьвятары выбіралі маладое здаровае ягня, заколвалі яго і вылівалі кроў для ачышчэньня народа ад грахоў.[27] Калі сышоў на зямлю і памёр на крыжы Хрыстос, Ягоная ахвярная сьмерць замяніла старазапаветны абрад. Дзякуючы таму, што Збаўца Хрыстос памёр на крыжы, як Божае беспахібнае і бязгрэшнае Ягня, мы цяпер можам атрымаць дараваньне грахоў і быць прыняты ў Ягоную сям’ю. Апостал Павал прыгадвае, што «мы маем адкупленьне Крывёю Ягонай, дараваньне грахоў, паводле багацьця ласкі Ягонай».[28]

Бог ратуе нас ад пагібелі ў пекле праз Свайго Сына Ісуса Хрыста, чыя крыжовая сьмерць сталася ахвярнай для нас. У працытаваных словах апостал згадвае пра Божую ласку, якая ёсьць незаслужаная намі Божая прыхільнасьць і зычлівасьць. Сваю ласку Бог вылівае на тых, хто шукае і навяртаецца да Яго з каяньнем і вераю ў Ісуса Хрыста як у свайго Збаўцу і Госпада. Заслужыць Божую ласку ніхто з нас ня можа, бо яна даецца кожнаму, хто прымае Хрыста, бясплатна; яна – чысты Божы дар.

---

[23]Першае пасланьне Пётры 2:22

[24]Дзеі апосталаў 2:23

[25]Дабравесьце паводле Яна 1:29

[26]Першае пасланьне 2:24

[27]Пасланьне да габрэяў 9:7

[28]Пасланьне да эфэсянаў 1:7

***Уваскрэсеньне Хрыста і яго ўплыў на нас***

Сьцьвярджаць, што Хрыстос ёсьць Бог і чалавек і што Ён даруе людзям грахі, – гэта адно, а ці даказана гэта нейкім чынам? Доказ мы знаходзім у тым, што Ісус Хрыстос уваскрэс зь мёртвых. Ніякі іншы рэлігійны лідэр ня можа сказаць падобнае пра сябе альбо даказаць сваю боскасьць. Толькі Ісус Хрыстос гэта зрабіў! Апостал Пётра засьведчыў: «Гэтага Ісуса Бог уваскрэсіў, чаго ўсе мы сьведкі».[29] Уваскрэсеньне Хрыста зь мёртвых даказвае Ягоную боскасьць і сілу дараваць нам грахі, і тыя, хто ўвераваў і прыняў Яго, адчуваюць даравальную і ўмацавальную сілу Збаўцы. Яны пачалі жыць новым зьмененым жыцьцём з Божай сілай, як напісаў апостал Павал: «Хто ў Хрысьце, той – новае стварэньне; старажытнае мінула, цяпер усё новае…Як Хрыстос уваскрэс зь мёртвых славаю Айца, так і нам хадзіць у абноўленым жыцьці».[30] Гэтае новае жыцьцё даецца таму, хто зьвяртаецца да Бога з прызнаньнем і каяньнем у сваёй грэшнасьці, зь вераю і прыняцьцем Ісуса Хрыста за свайго асабістага Збаўцу і Госпада-Уладара. Ня толькі дараваньне грахоў мы атрымліваем, але і Божую сілу жыць пабожным жыцьцём, што азначае мы ня проста стараемся выконваць усе Божыя загады, а спадзяёмся на Гасподнюю сілу і атрымліваем здольнасьць жыць праведна паводле Ягоных запаведзяў. Ці азначае гэта, што, уверваўшы, мы перастанем грашыць? Не, бо мы ўсё-ж-такі застаёмся людзьмі з натурай, прыхільнай да грашэньня, але па навярненьні да Хрыста мы ўжо не павінны быць пад кантролем грэшнай натуры, а Збаўцы Хрыста. Сіла, якой мы ня мелі раней, цяпер нам перадаецца, каб жыць тым праведным хрысьціянскім жыцьцём.

Уваскрэсеньне Ісуса Хрыста зь мёртвых служыць доказам таго, што Бог пераможа ўсякае зло і прывядзе усіх бязбожнікаў да поўнай адказнасьці за іхнія няверства і грахі. Біблія паведамляе пра той час у будучым, калі Бог пераможа шатана і ягоных памагатых, укінуўшы іх у пекла. Біблія таксама вучыць, што бязбожнікі, якія не пакаяліся перад Богам і адмовіліся ўвераваць у Ісуса Хрыста, таксама будуць пакараны. А тыя, хто ў зямным жыцьці пакаяліся ды прынялі Хрыста за Збаўцу і Госпада ды жылі пад Ягоным кіраваньнем, увойдуць у шчасьлівае вечнае жыцьцё. Апостал Павал пра гэта запісаў: «Ён [Бог Айцец] вызначыў дзень, у які будзе справядліва судзіць сьвет праз загадзя вызначанага Ім Мужа, даўшы доказ усім, уваскрэсіўшы Яго зь мёртвых».[31] Гэтакім чынам Бог пакарае кожнага, хто грашыў, і ўзнагародзіць кожнага, хто навярнуўся да Яго, уверавў і прыняў Ісуса Хрыста сваім Ратавальнікам і Гаспадаром.

[29] Дзеі сьвятых апосталаў 2:32

[30] Другое пасланьне да карынфянаў 5:17

[31] Дзеі сьвятых апосталаў 17:31

***Крокі да Бога і Хрыста***

Калі ўсё гэта будзе так, як гаворыцца ў Бібліі, дык нас цікавіць асноўнае пытаньне: што кожнаму з нас трэба рабіць, каб стаць хрысьціянінам і адчуваць Божую прысутнасьць у сваім жыцьці? Біблія дае ясны адказ на гэтае пытаньне.

Па-першае, трэба зьвярнуцца да Бога з каяньнем, просячы прабачэньня за грахі, учыненыя намі, як сказана было апосталам Пётрам: «Пакайцеся і навярніцеся, каб загладзіліся грахі вашыя».[32] Мы ўжо ведаем, што, дзякуючы ахвярнай сьмерці Хрыста кожнаму, хто спавядаецца перад Богам у сваёй грэшнасьці і вядомых грахах, атрымлівае прабачэньне. Каяньне мае тое значэньне, што чалавек прызнае сябе грэшнікам перад сьвятым і маральна дасканалым Богам і просіць дараваньне грахоў у Яго. Гэта таксама азначае, што вернік просіць у Бога сілы перамагаць грэшныя памкненьні і абяцае жыць пабожна, згодна таму, як Бог падказвае яму праз Сваё слова.

Па-другое, чалавек павінен увераваць у Ісуса Хрыста, прыняць Яго за асабістага Збаўцу і Госпада-Уладара. Тут вернік пагаджаецца з тым, што ў Бібліі гаворыцца пра Ісуса Хрыста, прымае гэта за неаспрэчную праўду, менавіта, што Ісус Хрыстос ёсьць Божы Сын і Збаўца, што Ён памёр ахвярнай сьмерцю за нас. У гэтым вернік цалкам спадзяецца на Ісуса Хрыста для свайго збаўленьня. Калі хто так робіць, Ісус Хрыстос ўваходзіць у ягонае сэрца Духам Сьвятым і духоўна адраджае яго да новага жыцьця. Інакш кажучы, Ён дае верніку тое, што Хрыстос назваў нараджэньнем звыш, нараджэньнем ад Духа Сьвятога.[33]

Тут жа мне трэба крыху спыніцца ў пералічваньні крокаў да Бога і Хрыста і дадаць наступнае тлумачэньне. Слова Божае вучыць, што калі хто зьвяртаецца да Бога, веруе ў Ісуса Хрыста ды прымае Яго сваім асабістым Збаўцам і Госпадам-Уладаром, ён не становіцца цалкам бязгрэшнай асобай. Нават веруючыя грашаць, але яны мусяць змагацца супроць сваёй цягі да грашэньня і сваім часам атрымаць перамогу над грахамі, якія ўчыняюць. Змаганьне супроць грахоў працягваецца аж да моманту нашай сьмерці. Калі вернік грашыць, ён можа атрымаць прабачэньне споведзьдзю перад Богам. Багаслоў Ян так піша: «Калі кажам, што ня маем грэху, ашукваем самі сябе, і праўды няма ў нас. Калі ж вызнаём грахі нашыя, дык Ён, верны і справядлівы, даруе нам грахі нашыя і ачысьціць нас ад усякай няправеднасьці».[34] Але ці гэта

[32]Там жа, 3:19

[33]Дабравесьце паводле Яна 3:3-6

[34]Першае пасланьне Яна 1:8-9

азначае, што веруючы можа паўторна і бесьперастанку грашыць і спавядацца ў граху? Не! Калі чалавек паўторна ўчыняе адзін і той самы грэх і кожны раз прыходзіць да Бога і просіць прабачэньня, дык гэта паказвае, што ён таго грэху не пакідае і ня думае сур’ёзна спыніць яго. Ніякага прабачэньня ня можа быць такому чалавеку. Багаслоў Ян дадае наступныя словы: «Кожны, хто жыве ў Ім (у Хрысьце), ня грэшыць… кожны, народжаны ад Бога, ня робіць грэху, бо насеньне Ягонае жыве ў ім, і ён ня можа грашыць, бо народжаны ад Бога».[35] У гэтых словах маецца на ўвазе той факт, што сапраўдны вернік *паўторна* ня грэшыць, бо з Божай дапамогай змагаецца супроць грахоў і сваім часам атрымлівае перамогу над імі.

Трэцяе патрабаваньне зводзіцца да таго, што чалавеку трэба вызнаваць Ісуса асабістым Збаўцам і Госпадам-Уладаром, як піша апостал Павал: «Калі вуснамі будзеш вызнаваць Ісуса за Госпада і сэрцам тваім верыць, што Бог уваскрэсіў Яго зь мёртвых, ты ўратуесься, бо сэрцам вераць дзеля праведнасьці, а вуснамі вызнаюць на збаўленьне».[36] Гэтым самым мы сьведчым іншым людзям, што мы ўверавалі і прынялі Ісуса Хрыста за свайго асабістага Збаўцу і Госпада і робім усё магчымае, каб жыць для Ягонай славы, часамі нават пераносячы ганеньне і зьнявагу ад іншых за непахісную веру ў Яго. Хрыстос заўважае нашую рашучасьць быць зьвязаны зь Ім: «Кожнага, хто вызнае Мяне перад людзьмі, таго вызнаю Я і перад Айцом Маім, Які ёсьць у нябёсах».[37]

Чацьвёртае патрабаваньне – прыняцьце сьвятога воднага хрышчэньня. У дні апосталаў тыя, хто вераваў і прымаў Хрыста ды вызнаваў Яго сваім Збаўцам і Госпадам, былі ахрышчаны ў вадзе. Грэцкае слова «баптыдзо», што на нашай мове перакладваецца на «хрышчэньне» альбо «хрост», нясе літаральнае значэньне «апусканьне» або «акунаньне». Тут жа разумеецца, што акт хрышчэньня праводзіцца апусканьнем або мамэнтальным акунаньнем верніка ў ваду. Для верніка хрышчэньне нясе глыбокае духоўнае значэньне: яго апускаюць ў ваду ў знак таго, што ён памірае для старога эгаістычнага жыцьця і падымаецца з вады ў знак таго, што духоўна ўваскрасае разам з Хрыстом для новага пабожнага жыцьця. Паводле апостала Паўла: «Няўжо ня ведаеце, што ўсе мы, хрышчаныя (акунутыя) ў Ісуса Хрыста, у сьмерць Ягоную ахрысьціліся (акунуліся). Дык вось мы і пахаваныя зь Ім хрышчэньнем (акунаньнем) у сьмерць, каб, як Хрыстос уваскрэс зь мёртвых славаю Айца, так і нам

[35]Там жа, 3:6-9

[36]Пасланьне да рымлянаў 10:9-10

[37]Дабравесьце паводле Мацьвея 10:32

хадзіць у абноўленым жыцьці».[38] У Дзеях сьвятых апосталаў запісаны адказ апостала Пётры, калі пры юдэйскай Пяцісятніцы слухачы спыталіся ў яго, што ім трэба рабіць, каб выконваць Божую волю? Ён сказаў: «Пакайцеся, і хай ахрысьціцца кожны з вас у імя Ісуса Хрыста на дараваньне грахоў, – і атрымаеце дар Сьвятога Духа».[39]

І яшчэ адно важнае патрабаваньне. Хоць Дух Сьвяты пастаянна прабывае ў нас і дапамагае нам жыць пабожна, трэба заставацца верным Богу і Ісусу Хрысту да канца зямнога жыцьця. У кнізе Адкрыцьцё сказана так: «Будзь верны да сьмерці, і дам табе вянок жыцьця».[40] Тут маецца на ўвазе вернасьць Ісусу Хрысту і вянок жыцьця служыць сымбалем узнагароды ў Божым Нябесным Царстве. Госпад адразу не бярэ чалавека, які ўвераваў у Яго, да Сябе ў неба, а пакідае яго на зямлі дзеля дзьвюх асноўных задачаў – духоўнага росту і сталасьці ў хрысьціянскай веры і жыцьці ды далейшага служэньня Богу і людзям тут на зямлі.

***Дух Сьвяты дапамагае нам жыць паводле Господняй волі***

Чалавек, які жыве бяз Бога, сам сабе вызначае, што грэшнае або нягрэшнае, аднак калі ён навяртаецца да Бога, ён вяртае гэтае права Богу. Па навярненьні ён знаёміцца з Божай воляй, зь Ягонымі загадамі, якія адкрываюцца яму на старонках Бібліі. Вернік просіць Господняга падмацаваньня і кіраваньня, каб рабіць тое, што адпавядае Божай волі. Ён спадзяецца на Господнія ўказаньні, як яму далей жыць. Бог робіцца такому верніку сапраўдным Госпадам-Уладаром, Які вядзе яго да мэтанакіраванага і паўнацэннага жыцьця. Да навярненьня чалавеку нестае той унутранай сілы, каб жыць паводле Божых запаведзяў. Калі чалавек навяртаецца да Хрыста, ён атрымлівае Господняе духоўнае падмацаваньне, каб жыць тым болей пасьлядоўна па Господніх наказах. Дух Сьвяты жыве ў верніку і дапамагае яму жыць па-Божаму.

Дух Божы дапамагае верніку і ў ягоных адносінах зь іншымі людзьмі. У Слове Божым ёсьць настаўленьні, якія растлумачваюць, як мы можам і павінны жыць у міры зь іншымі людзьмі, хай тое зь іншымі вернікамі або нявернікамі, і на такія адносіны нам таксама даецца Божая дапамога і кіраўніцтва. Не заўсёды лёгка заставацца ў міры і жыць нармальна зь некаторымі людзьмі, але калі мы просім Божай дапамогі, Ён дапамагае нам жыць зь імі. Здольнасьць жыць пабожна, любіць нават ворагаў і рабіць ім дабро – гэта нам перадаецца Богам. Апостал Павал так і

---

[38]Пасланьне да рымлянаў 6:3-4

[39]Дзеі сьвятых апосталаў 2:38

[40]Кніга Адкрыцьцё 2:10

напісаў: «Рабіце паводле Духа [Божага], і вы ня будзеце паддавацца пажадлівасьцям плоці… Плод Духа: любоў, радасьць, згода, доўгая цярплівасьць, добрасьць, міласэрнасьць, вера, лагоднасьць, стрымлівасьць… Калі мы жывём Духам, дык згодна з Духам будзем рабіць».[41] Госпад прымірае людзей, а безь Яго яны часта адчужаюцца і нават ідуць на вайну супраць ворагаў. Ізноў гэта ня раз падахвочвае нас марыць аб тым, як сытуацыя ў інтэрнацыянальных адносінах зьмянілася б, калі б улады нашых славянскіх краін своечасова пакаяліся ў сваіх грахах і памылках і навярнуліся да Хрыста з просьбай Ягонай дапамогі. Пры такой абстаноўцы мы ўбачылі б вялізарную розьніцу ад цяперашняга стану ўзаемаадносін. У старазапаветнай Другой кнізе летапісаў мы знаходзім слушныя словы, якія можна было б прымяніць да любога народа і краіны. У дачыненьні да габрэйскага народа Бог выказаўся цару Саламону такімі словамі: «Калі ўпакорыцца народ Мой, які завецца імем Маім, і будзе маліцца і шукаць аблічча Маё, і адвернуцца ад сваіх ліхіх шляхоў, Я пачую зь неба і прабачу грахі іхнія, і аздараўлю зямлю іхнюю».[42] Ці мы і ўлады нашых краін, дзе мы жывём, гатовыя слухацца Госпада Бога і рабіць тое, што гэтымі словамі сказана? Думаецца, гэта было б цудоўна, але, на жаль, такога найчасьцей мы ня бачым.

### *Для верніка Божага няма нічога марнага*

Ідзём далей у выніках таго, што Бог робіць для верніка. Ён дабраслаўляе яго і нават у справе ягонай працы, што робіць яе значнай і вартаснай. Веруючаму ў Хрыста нават самая нецікавая і нудная праца для Госпада важкая, і Ён заўважае, як мы ёю служым іншым. Слова Божае кажа, што мы – Гасподняе стварэньне і атрымалі новае жыцьцё ад Бога дзеля таго, каб рабіць дабро іншым людзям.[43] У нашай працы мы павінны служыць іншым, бо, робячы гэта, мы служым Богу. Бог дае кожнаму асаблівыя дары і здольнасьці, і нам даводзіцца ўжываць іх на дабро іншым, памятаючы, што ўзнагароду за гэта мы атрымаем ад Госпада. Апостал Павал так і піша: «Усё, што вы робіце словам ці ўчынкам, усё рабіце ў імя Госпада Ісуса Хрыста, дзякуючы праз Яго Богу і Айцу…і ўсё, што робіце, рабіце ад душы, як Госпаду, а не чалавеку, ведаючы, што ў аддзяку ад Госпада дастанеце спадчыну, бо вы служыце Госпаду Хрысту».[44] Пасьля грэхападзеньня Адама і Евы Бог пракляў зямлю і цяпер многім людзям даводзіцца цяжка працаваць, каб выжываць. Таксама праца для

[41]Пасланьне да галятаў 5:16-25

[42]Другая кніга летапісаў 7:14

[43]Пасланьне да эфэсянаў 2:10

[44]Пасланьне да каласянаў 3:17 і 3:23-24

многіх прыносяць мала радасьці, але для пасьлядоўніка Ісуса Хрыста ўсякая праца ня можа быць незначымай. Бог заўважае і адзначае, як мы працуем, нават калі нашая праца нам здаецца нецікавай і журботнай. Верніку нічога ў жыцьці не аказваецца марным, калі ён служыць іншым і з руплівасьцю працуе дзеля славы Гасподняй.

Навяртаньне да Бога мяняе наш погляд нават на сьмерць. У Бібліі сказана пра чалавека, што «пыл ты і ў пыл вернесься».[45] Мы ўсе памром; такое фізычнае скананьне чакае кожнага з нас. І той, хто памірае бяз Бога, памірае без усякай надзеі на лепшае заўтра. Для хрысьціяніна сытуацыя зусім інакшая: ён памірае з надзеяй, што ўваскрэсьне да новага жыцьця і існаваньня ў суцяшальным і радасным сьвеце. Апостал Павал заяўляе, што веруючым няма прычыны маркоціцца, бо яны ўваскрэснуць зь мёртвых так, як сталася са Збаўцам Ісусам Хрыстом. Чытаем словы апостала на гэты конт гэтакія: «Калі мы верым, што Ісус памёр і ўваскрэс, дык і памерлых у Ісусе Бог прывядзе зь Ім…Сам Госпад пры абвяшчэньні, пры голасе арханёла і трубе Божай, сыдзе зь неба, і мёртвыя ў Хрысьце ўваскрэснуць раней, потым мы, хто застанецца жывы, разам зь імі ўзятыя будзем на воблакі на сустрэчу з Госпадам у паветры, і так вечна з Госпадам будзем».[46] Мы атрымаем новыя целы, падобныя да новага цела Збаўцы Ісуса Хрыста, у якім Ён паявіўся пасьля ўваскрэсеньня зь мёртвых. Паводле словаў апостала Паўла: «Тленнае гэтае апранецца ў нятленнасьць і сьмяротнае гэтае апранецца ў несьмяротнасьць, тады збудзецца слова напісанае: паглынута сьмерць перамогаю. Сьмерць! дзе тваё джала? Пекла! дзе твая перамога?».[47] Шаноўны чытачу, мы ўсе хочам жыць і жыць шчасьліва. Бог дае нам такую мажлівасьць, – і тое на ўсю вечнасьць, – калі мы гатовыя прыняць Ягонае Слова і тлумачэньні.

Замест духоўнай і цялеснай сьмерці вернік атрымае вечнае жыцьцё, якое ня толькі датычыцца ягонага будучага замагільнага жыцьця, а пачынаецца ўжо з моманту ягонага ўвераваньня ў Ісуса Хрыста тут на зямлі. У Дабравесьці паводле Яна мы чытаем такія словы: «Гэта напісана, каб вы ўвералі, што Ісус ёсьць Хрыстос [абяцаны Богам Мэсія], Сын Божы, і, веруючы, мелі жыцьцё вечнае ў імя Ягонае».[48] Гэтыя словы былі напісаны дзеля таго, каб мы ўпэўніліся ў тым, што па веры ў Хрыста мы ўжо цяпер маем вечнае жыцьцё. Калі памром, то пойдзем туды, дзе знаходзіцца Ісус Хрыстос. У Першым пасланьні багаслова Яна мы чытаем такія

[45]Быцьцё 3:19

[46]Першае пасланьне да фесалонікійцаў 4:14-17

[47]Першае пасланьне да карынфянаў 15:54-55

[48]Дабравесьце паводле Яна 20:31

пацьвярджальныя і суцяшальныя словы: «Сведчаньне гэтае ў тым, што Бог дараваў нам жыццё вечнае, і гэтае жыццё ў Сыне Ягоным. Хто мае Сына Божага, мае жыццё; хто ня мае Сына Божага, ня мае жыцьця. Гэта напісаў вам я, хто верыць у імя Сына Божага, каб вы ведалі, што вы, веруючы ў Сына Божага, маеце жыццё вечнае».[49] І якім будзе вечнае жыццё з Богам? Самым шчасьлівым і памысным! У небе ня будзе ніякіх пакутаў, ніякай маркоты, ніякага гора. У апошняй кнізе Бібліі пішацца пра той час, калі «утрэ Бог кожную сьлязіну з вачэй іхніх, і сьмерці ня будзе ўжо; ні плачу, ні енку, ні хваробы ўжо ня будзе, бо ранейшае прайшло».[50]

***Як адрэагуем на Хрыстова запрашэньне?***

Паважаны чытачу! Мы пачалі з думкі, што жывём у сьвеце, перапоўненым усялякімі пакутамі і перажываньнямі. Кожны з нас па-рознаму ўспрымае гэтую рэчаіснасьць. Паводле Бібліі Бог, наш Творца, хоча, каб мы, Ім створаныя істоты, знайшлі Яго і ўвайшлі ў Ягонае Нябеснае Царства, дзе ў будучым будзе панаваць радасьць і ўсякая ласкавасьць. Хрыстос сказаў: «Прыйдзіце да Мяне, усе струджаныя і прыгнечаныя, і Я супакою вас. Вазьміце ярмо Маё на сябе і навучыцеся ад Мяне, бо Я лагодны і пакорлівы сэрцам, і знойдзеце спакой душам вашым, бо ярмо Маё добрае, і цяжар Мой лёгкі».[51] Ці кожны з нас увойдзе ў Ягонае Царства? Гэта залежыць ад кожнага з нас паасобку. Як ты, паважаны чытачу, адрэагуеш на Госпаднія прапановы і ласку? Што тычыцца мяне асабіста, я і многія іншыя ўжо вераю прынялі Ягоны дар збаўленьня і спадзяюцца на Ягоную ласку, якая дзейнічае ў верніках. Спадзяюся, што ты таксама, калі пакуль што гэтага не зрабіў, навернесься да Бога вераваньнем у Хрыста і прыняцьцем Яго за свайго асабістага Збаўцу і Госпада-Уладара. Калі яшчэ гэтага не зрабіў, можаш зьвярнуцца да Хрыста самай простай малітвай, у якой выкажаш сваю веру ў Яго як Збаўцу і папросіш у Яго прабачэньне грахоў. З гэтага ўсё пачынаецца. І папрасі ў Хрыста, каб Ён прывёў цябе да суполкі Ягоных вернікаў, якія дапамогуць табе узрастаць далей у хрысьціянскай веры і жыцьці.

І пры канцы гэтага артыкула мне карціць яшчэ дадаць наступнае. Бог хоча, каб мы праяўлялі любоў да іншых сваімі добрымі ўчынкамі. Ніхто з нас ня ведае, што ў бліжэйшым будучым адбудзецца ў нашым сьвеце. Войны паміж нашымі славянскімі і іншымі народамі пачынаюцца, працягваюцца і своечасова канчаюцца. Зразумела, мы ўсе жадаем міру і спакою паміж краінамі і народамі. Паколькі гэта залежыць ад нас, мы павінны рабіць усё магчымае з нашага боку, каб спрыяць міру ў сьвеце.

[49]Першае пасланьне Яна 5:11-13

[50]Кніга Адкрыцьцё 21:4

[51]Дабравесьце паводле Мацьвея 11:28-29

Думаецца, што прыйдзе час, калі нашая Беларусь адкрыецца для многіх здольных беларусаў прыняць удзел у перабудове яе. На гэта мы павінны быць гатовымі. Будзьма прасіць у Бога Ягонага ўдзелу і кіраваньня ў справах нашай любезнай Беларусі і ў нашых жыцьцях для яе перабудовы, калі зьявіцца такая мажлівасьць. Варта тут яшчэ раз прыгадаць словы, выказаныя старазапаветнаму цару ізраільцян Саламону. Іх мы можам прыстасаваць да сябе, свайго народа і роднай краіны: «Калі ўпакорыцца народ Мой, які называецца імем Маім, і будуць маліцца і шукаць аблічча Майго, і адвернуцца ад благіх шляхоў сваіх, дык Я пачую зь неба і дарую грахі іхнія і ацалю зямлю іхнюю».[52]

**Yuras Rapetsky: Biblical answer to human dilemma**
***(web-magazine "Culture. Nation", issue 34, November 2024, 70-90, www.sakavik.net)***

*Abstract*. For Christians the Bible is their fundamental book. Aside from various issues, the Bible speaks much about man's dilemma and his need to have and maintain close relationships with God and other people. The author of the article, entitled "The Bible's Answer to Man's Dilemma," demonstrates how the Bible speaks much of man's problem of evil. It teaches that God desires to have a close relationship with people, also change them into better persons in their relationships with God and others. Unfortunately, a dividing issue arises between God and man, namely, man's sins. This was first apparent during the lives of Adam and Eve, God's first created couple. They were placed in the Garden of Eden and being there they eventually contravened God's command. For this they were expelled from Eden and committed to a complex life with grave difficulties. In his article the author points to results of human sinfulness which is being felt by all persons individually and even in relationships among nations. The Bible states that people have a need for a Saviour from their sins and results. Jesus Christ is stated to be that, Saviour. Jewish authorities sentenced Christ to crucifixion on a cross as a blasphemer when in fact He died as a godly sacrifice for man's sins. He rose again from the dead which opened the way for believers in Him to be pardoned for their sins and receive the gift of joyous eternal life. Whenever individuals and whole nations turn to Jesus Christ, accepting Him as personal Saviour and Lord, He changes them into better people. That can become one's reality today and could also touch our present Slavic nations and countries.

[52]Другая кніга летапісаў 7:14

**Ю.Репецки: Библейский ответ на человеческую дилемму**
***(веб-журнал "Культура. Нация", вып. 34, ноябрь 2024, 70-90, www.sakavik.net)***

*Аннотация*. Для христиан основной книгой является Библия. Помимо различных вопросов в Библии много сказано о человеческой дилемме установить и поддерживать тесное общение с Богом и людьми. Автор статьи «Библейский ответ на человеческую дилемму» показывает, что в Библии немало пишется о человеческой проблеме зла. Согласно библейскому учению, Бог желает близкого общения с людьми, их переменить к лучшему как в отношении с Ним, так и в отношении с другими людьми. Между Богом и людьми возникает преграда – именно, человеческие грехи. Это было впервые проявлено в жизни первых Богом сотворённых людей, Адама и Евы, которых Бог поселил в Эдемском саде. Они нарушили Божий закон и за это были выгнаны из этой прекрасной местности и предназначены на сложную жизнь со всякими житейскими трудностями. В статье автор пишет о результатах человеческой греховности, влияние которого ощущается каждым человеком и даже наблюдается в отношениях между народами. Библия утверждает, что люди нуждаются в Спасителе от грехов и их последствий. Тем необходимым Спасителем стал Исус Христос. Еврейские власти приговорили Христа к распятию на кресте, считая Его богохульником, когда на самом деле Он умер как Божественная жертва за человеческие грехи и воскрес из мёртвых для оправдания верующих в Него. Смерть и воскресение Христа предоставили человечеству возможность получить прощение грехов и радостную вечную жизнь. Всякий раз, когда отдельные люди и целые народы обращаются к Христу и принимают Его своим Спасителем и Господом, Он превращает их жизнь к лучшему. Это может стать реальностью для каждого из нас отдельно и в отношениях между нашими славянскими народами и странами.